(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

УДК 94 (476) (XVI ст. – пач. XX ст.)

**Вікол**
**Людміла Фёдараўна**

# ФАРМІРАВАННЕ І РАЗВІЦЦЁ СІСТЭМЫ ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ Ў БЕЛАРУСІ Ў XVI – ПАЧАТКУ XX СТСТ.

Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук

па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Мінск, 2016

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)

Работа выканана ва УА “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы”.

Навуковы кіраўнік: **Сяльверстава Святлана Яўгенаўна,**
доктар гістарычных навук, дацэнт.

Афіцыйныя апаненты: **Голубеў Валянцін Фёдаравіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар,
загадчык Цэнтра спецыяльных гістарычных навук і антрапалогіі
ДНУ “Інстытут гісторыі НАН Беларусі”;

**Яшчанка Аксана Рыгораўна,**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
загадчык кафедры гісторыі Беларусі
УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны”.

Апаніруючая арганізацыя – УА “Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт”.

Абарона адбудзецца «28» красавіка 2016 г. у 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.05 пры Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце па адрасе: 220030, Мінск, вул. Ленінградская, 8 (корпус юрыдычнага факультэта), аўд. 407.
Тэлефон вучонага сакратара: 209-57-09.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «__» сакавіка 2016 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
доктар гістарычных навук дацэнт А.А. Гужалоўскі

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


# УВОДЗІНЫ

Грамадскае харчаванне – гэта галіна народнай гаспадаркі па вытворчасці і рэалізацыі гатовай ежы насельніцтву праз сетку сталовых, кафэ, рэстаранаў, буфетаў[1]. Пад грамадскім харчаваннем таксама разумеецца працэс спажывання ежы ў спецыялізаваных установах[2]. Яно займае важнае месца ў сектары эканомікі, валодае сваёй спецыфікай, асаблівасцямі фарміравання, развіцця, а таксама прызначэннем, якое заключаецца ў задавальненні патрэб насельніцтва ў ежы, камунікацыі, адпачынку.

Неабходнасць вывучэння гісторыі грамадскага харчавання на Беларусі мае сваё тэарэтычнае і практычнае значэнне і абумоўлена мноствам прычын. Па-першае, вывучэнне грамадскага харчавання мае тэарэтычную значнасць, так як выяўляе механізм узаемадзеяння асобных элементаў гэтай галіны эканомікі і характарызуе дадзеную з’яву як цэласную сістэму. Па-другое, сучаснае развіццё эканомікі Рэспублікі Беларусь патрабуе не толькі новых інавацыйных падыходаў, але і пераймання гістарычнага вопыту, у тым ліку і ў сферы грамадскага харчавання. Дадзеная работа дае магчымасць прасачыць генезіс сістэмы грамадскага харчавання як часткі эканомікі і абаперціся на назапашаны вопыт. Па-трэцяе, вывучэнне прававой сферы, што датычыцца ўстаноў харчавання, дазваляе не толькі абапірацца на вопыт, але і выпрацоўваць эфектыўныя шляхі заканадаўчай рэгламентацыі грамадскага харчавання. Па-чацвёртае, у аспекце развіцця турызму даследаванне становіцца асабліва актуальным, так як дае магчымасць рэканструяваць аўтэнтычны побыт і каларыт традыцыйных устаноў харчавання, што можа зрабіць больш прывабнай і адметнай сучасную сацыяльную інфраструктуру. Па-пятае, распрацоўка дадзенай тэматыкі мае важны выхаваўчы аспект, які выяўляецца праз магчымасць рэканструкцыі традыцый нацыянальнай кухні (рэгіянальнасць і экалагічнасць), удасканаленне культуры адпачынку, спажывання ежы і спіртных напіткаў.

У дадзенай рабоце ўпершыню ў беларускай гістарычнай навуцы даследуюцца наступныя праблемы: узаемадзеянне традыцый грамадскага харчавання і інавацый у эканамічным і грамадска-сацыяльным жыцці; трансфармацыя ў часе функцый, відаў і ролі ўстаноў грамадскага харчавання; змены ў стасунках дзяржавы да сферы грамадскага харчавання.

---

[1] Батура, А. А. Грамадскае харчаванне / А. А. Батура // Беларус. энцыкл. : у 18 т. – Мінск, 1997. – Т. 5. – С. 397.

[2] Курьянович, А. В. История повседневности: проблемы источниковой базы / А. В. Курьянович // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны : зборнік / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2002. – Вып. 1. – С. 44–49.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі

Дысертацыя звязана з выкананнем навукова-даследчай тэмы «Гарады і мястэчкі Беларусі ў канцы XVIII–пачатку XX стст.» (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі – 20120680) як часткі падпраграмы 1 «Гісторыя, духоўная і матэрыяльная культура беларускага народа» ў рамках Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі» на 2011–2015 гг.

### Мэта і задачы даследавання

**Мэта:** раскрыць сутнасць грамадскага харчавання на тэрыторыі Беларусі ў XVI–пачатку XX стст. як сістэмы, якая мае структурную іерархію, функцыі, асаблівасці трансфармацыі ў сувязі з палітычнымі, эканамічнымі і сацыяльнымі зменамі ў грамадстве.

Раскрыццё пастаўленай мэты патрабуе рэалізацыі наступных **задач:**

1) Ахарактарызаваць пачатковы этап фарміравання сістэмы грамадскага харчавання ў XVI–XVIII стст. з вызначэннем асноўных структурных элементаў дадзенай сістэмы. Прасачыць складванне падстаў заканадаўча-прававой базы ў сферы дзейнасці ўстаноў харчавання і вылучыць першы тып установы харчавання на беларускіх землях, яго функцыі і ролю ў грамадстве ў азначаны час.

2) Паказаць функцыянальную і структурную эвалюцыю сферы грамадскага харчавання ў сувязі з уваходам беларускіх зямель у склад Расійскай Імперыі; прасачыць працэс пераходу гэтай сістэмы пад дзяржаўны кантроль і рэгуляванне; вызначыць змены ў тыпах устаноў харчавання; акрэсліць іх месца ў жыцці грамадства.

3) Вызначыць характэрныя рысы завяршальнага перыяду афармлення сістэмы грамадскага харчавання ў другой палове XIX – пачатку XX стст. і паказаць ключавыя моманты ў функцыянальнай трансфармацыі сферы грамадскага харчавання як асобнай сістэмы на тэрыторыі Беларусі.

**Аб’ектам** даследавання з’яўляюцца сацыяльна-эканамічныя і культурныя працэсы, што адбываліся на беларускіх землях у XVI – пачатку XX стст.

**Прадметам** даследавання стала фарміраванне і развіццё сістэмы грамадскага харчавання.

**Храналагічныя межы** ахопліваюць адрэзак часу з XVI да пачатку XX стст. У гэты перыяд адбываўся працэс дынамічнага фарміравання і развіцця асноўных структурных элементаў сістэмы грамадскага харчавання. Ранняя мяжа даследавання пачынаецца з 1529 г., калі рэгуляванне дзейнасці ўстаноў харчавання было замацавана на высокім дзяржаўным узроўні ў артыкулах

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


першага Статута ВКЛ. Такім чынам пачала ствараццa сістэма, у якой акрэсліваліся роля дзяржавы ў дадзенай галіне эканомікі, функцыі ўстаноў грамадскага харчавання, правы і абавязкі трымальнікаў гэтых устаноў і іх кліентаў. Верхняя мяжа даследавання даводзіцца да 1914 г., калі ў сувязі з пачаткам першай сусветнай вайны сістэма, якая склалася раней, была разбураная і фактычна перастала існаваць.

**Тэрытарыяльныя рамкі** работы супадаюць з сучаснымі межамі Беларусі. Тым не менш, паводле задач даследавання, часам выкарыстоўваецца фактaлагічны матэрыял з гістарычна звязанымі з Беларуссю землямі.

**Навуковая навізна**

У даследаванні ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі ахарактарызаваны працэс станаўлення грамадскага харчавання на тэрыторыі Беларусі як сістэмы, якая мае свае функцыі, структуру, механізмы трансфармацыі. Дадзена характарыстыка месца дзяржавы ў рэгуляванні сферы грамадскага харчавання і прааналізаваны накірункі і вынікі дзяржаўнай палітыкі адносна рэгламентацыі дзейнасці ўстаноў харчавання. Выяўлена роля ўстаноў харчавання ў штодзённым жыцці насельніцтва. Прадстаўлены прычыны і вынікі пераходу ад карчмы як універсальнага пункта грамадскага харчавання з шырокім функцыяналам да спецыялізаваных паводле сацыяльнай градацыі, функцый і асартыменту ўстаноў.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. У XVI–XVIII стст. на беларускіх землях адбывалася фарміраванне галоўных структурных элементаў сістэмы грамадскага харчавання. Першым структурным элементам вызначанай сістэмы сталі законы, якія рэгулявалі дзейнасць корчмаў і шынкоў, галоўным чынам, у сферы маёмаснага валодання і падаткаабкладання. На другім структурным узроўні знаходзіліся пункты харчавання (корчмы і шынкі), на якія распаўсюджвалася дзеянне тагачасных законаў. Трэцім структурным узроўнем сістэмы харчавання сталі катэгорыі кліентаў устаноў харчавання, а таксама ўласнікі або арандатары такіх устаноў. Сфера грамадскага харчавання выбудоўвала ўласную структуру, фармавалася як складаючая частка сістэмы эканомікі і соцыуму. У ёй праяўляліся важныя грамадска-сацыяльныя, эканамічна-гаспадарчыя, культурныя працэсы, характэрныя для грамадства таго часу. Гэта можна прасачыць на прыкладзе карчмы, якая вылучылася як першы тып установы харчавання на беларускіх землях з шырокім функцыяналам.

2. У канцы XVIII – першай палове XIX стст. сістэма грамадскага харчавання афармляецца ў асноўных сваіх рысах і трансфармуецца ў сувязі з уваходам беларускіх зямель у склад Расійскай Імперыі. У гэты перыяд пашыраецца сфера заканадаўчага рэгулявання адносна грамадскага харчавання. Дэталёва акрэсліваюцца правілы продажу тавараў ва ўстановах харчавання,

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


вызначаецца рэжым іх працы, вылучаюцца кампетэнцыі органаў кіравання ўстановамі харчавання. У гэты час з’яўляецца шэраг тыпаў устаноў харчавання, а корчмы паступова губляюць характар дэмакратычных асяродкаў: іх дзейнасць трапляе пад пільны кантроль з боку дзяржавы.

Трансфармуюцца і функцыі карчмы: у вёсцы гэтая ўстанова па-ранейшаму застаецца важным месцам міжасобасных стасункаў, а ў горадзе сацыяльная роля карчмы зніжаецца. Новыя пункты грамадскага харчавання, выціскаючы карчму з гарадской прасторы, набываюць спецыялізацыю ў адпаведнасці з месцам знаходжання, функцыямі, арыентаванасцю на асобную катэгорыю спажыўцоў: тракціры, закусачныя, буфеты і інш. У азначаны перыяд часу праблема распаўсюджвання п’янства і алкагалізму сярод насельніцтва пад уплывам акрэсленых фактараў становіцца надзвычай актуальнай, што паўплывала на фарміраванне адмоўнага вобразу карчмы ў грамадскай свядомасці.

3. У другой палове ХІХ – пачатку ХХ стст. адбываецца канчатковае афармленне сістэмы грамадскага харчавання на беларускіх землях. Па-першае, склаўся і папаўняўся корпус заканадаўчых і нарматыўных дакументаў, былі вызначаны органы кантролю і іх функцыі, што дазваляла дзяржаве рэгуляваць дзейнасць устаноў грамадскага харчавання. Дэталёвы кантроль дзяржавы над дадзенай сферай садзейнічаў прадухіленню злачынстваў, забяспечваў выпрацоўку і выкананне санітарна-гігіенічных нормаў дзейнасці і патрабаванняў да інтэр’еру і экстэр’еру ўстаноў харчавання, рэгламентаваў лакалізацыю на мясцовасці і рэжым працы, сачыў за арганізацыяй рэкрэацыі ў такіх установах. Па-другое, у дадзены перыяд канчаткова афармляецца іерархія тыпаў устаноў харчавання, якія дэфірынцыраваліся па відах і па коштах паслуг, былі арыентаваны на розныя групы кліентаў.

У гэты час вызначаюцца праблемы, якія мелі глыбінны характар і ўплывалі на функцыянаванне сістэмы харчавання. Важнейшай з іх была супярэчнасць паміж жаданнем дзяржавы атрымаць найбольшы прыбытак ад продажу алкагольных напіткаў і адначасова стрымаць распаўсюджванне алкагалізму сярод насельніцтва. Гэтая супярэчнасць заставалася актуальнай да канца вывучаемага перыяду. Барацьба супраць п’янства і алкагалізму таксама паўплывала на дзейнасць устаноў грамадскага харчавання. У другой палове ХІХ ст. традыцыйныя функцыі карчмы цалкам трансфармаваліся, і карчма страціла сваю важную ролю эканамічнага і сацыяльнага асяродка.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені**

Дысертацыя з’яўляецца самастойным аўтарскім навуковым даследаваннем. У працы на падставе грунтоўнага вывучэння гістарычных крыніц (з фондаў НГАБ у г. Гродне, НГАБ у г. Мінску, РДГА у Санкт-Пецярбурзе, Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве) былі вылучаны

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


этапы фарміравання сістэмы грамадскага харчавання і роля дзяржавы ў развіцці дадзенай сістэмы. Прааналізавана значэнне ўстаноў харчавання ў эканамічным, грамадскім і культурным жыцці соцыуму. Дадзена ацэнка карчмы як адметнага тыпу ўстановы харчавання на беларускіх землях. Значная частка крыніц з'яўляецца слабадаследаванай і ўпершыню ўведзена ў навуковы абарот.

Пры ўдзеле сааўтараў навуковых артыкулаў вызначаны асноўныя накірункі гістарыяграфічных даследаванняў па праблеме (С. Марозава), акрэслены адметнасці архітэктурнай забудовы корчмаў (С. Сергачоў), прааналізаваны дадзеныя археалагічных матэрыялаў як гістарычных крыніц па вывучэнні корчмаў (Л. Калядзінскі).

**Апрабацыя дысертацыі**
**і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Вынікі даследавання былі апрабіраваны на 16 навуковых канферэнцыях (з іх 10 – міжнародных, 6 – рэспубліканскіх): навуковая канферэнцыя «Вывучэнне роднага краю як сродак патрыятычнага выхавання моладзі» (Мінск, 5 красавіка 2005 г.); II-я Рэспубліканская навуковая канферэнцыя «Студенческая наука как фактор личностного и профессионального развития будущего специалиста» (Мінск, 28 красавіка 2006 г.); Рэспубліканская навуковая канферэнцыя «Старажытныя гарады. Праблемы даследавання, музеефікацыі, захавання помнікаў і гістарычных тэрыторый» (Заслаўе, 26 снежня 2006 г.); VI-я Міжнародная навуковая канферэнцыя «Шаўчэнкаўская вясна» (Кіеў, 20 сакавіка 2008 г.); Міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Европа: актуальные проблемы этнокультуры» (Мінск, 25 красавіка 2008 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя «Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі Беларусі» (Гродна, 25–27 верасня 2009 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Европа: актуальные проблемы этнокультуры» (Мінск, 23 чэрвеня 2011 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя «Метадалогія даследаванняў і крыніцазнаўчая база ў галіне гістарычнай урбаністыкі» (Гродна, 30 верасня – 1 кастрычніка 2011 г.); Рэспубліканская навуковая канферэнцыя «Актуальныя праблемы гістарычнай навукі і адукацыі» (Гродна, 24–25 лістапада 2011 г.); навуковая канферэнцыя маладых вучоных-пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ (Гродна, 24 лютага 2011 г.); Міжнародная навуковая канферэнцыя «Гродненщина в историческом, экономическом и культурном развитии 1801–1921 гг.» (Гродна, 22–23 верасня 2011 г.); V-я Міжнародная навуковая канферэнцыя «Культура, наука, образование в современном мире» (Гродна, 11–12 мая 2011 г.); VI-я Міжнародная навуковая канферэнцыя «Дни науки исторического факультета- 2013» (Кіеў, 25 красавіка 2013 г.); II-я Міжнародная навуковая канферэнцыя «Культура Беларуси: реалии современности» (Мінск, 12–13 чэрвеня 2013 г.); навукова-практычны семінар «Кірмаш. Мінулае,

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


сучаснае і будучае» (Зэльва, 23 жніўня 2013 г.); Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Гісторыя гандлю ў Беларусі (ад старажытнага часу да канца XX ст.): праблемы вывучэння і перспектывы даследавання)» (Мінск, 14–15 лістапада 2013 г.).

Матэрыялы даследавання выкарыстоўваюцца ў асветніцкай дзейнасці яўрэйскай арганізацыі «Менора», у краязнаўчай рабоце Залескай сельскай школы (Смаргонскі р-н), у культурна-асветніцкай рабоце Залескай сельскай бібліятэкі (акты ўкаранення: 01.12.2009 г., 18.08.2010 г., 23.08.2010 г., 12.07.2010 г.). Таксама апублікаваны 4 артыкулы ў навуковых энцыклапедычных выданнях.

**Апублікаванне вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі дысертацыі апублікаваны ў 22 навуковых працах, з якіх: 3 артыкулы ў навуковых выданнях у адпаведнасці з п. 18 «Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь» (агульным аб'ёмам 2,2 аўтарскага аркуша); 1 артыкул у навуковым часопісе «Архівы і справаводства»; 6 артыкулаў у зборніках навуковых прац; 12 артыкулаў у зборніках матэрыялаў канферэнцый.

Па выніках дысертацыі апублікаваны 4 артыкулы ў навуковых энцыклапедычных выданнях.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя ўключае пералік скарачэнняў і ўмоўных абазначэнняў, уводзіны, агульную характарыстыку работы, чатыры главы, заключэнне, бібліяграфічны спіс, 19 дадаткаў. Поўны аб'ём дысертацыі складае 209 старонак, у тым ліку 19 дадаткаў займаюць 61 старонку. Бібліяграфічны спіс змяшчае 478 найменняў, уключаючы ўласныя працы саіскальніцы (на 27 старонках).

## АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

У **першай главе «Гістарыяграфія, гістарычныя крыніцы, метадалогія і метады даследавання»** праведзены аналіз айчыннай і замежнай навуковай літаратуры, выяўлены інфармацыйны патэнцыял гістарычных крыніц, ахарактарызавана метадалогія і метады даследавання.

У **раздзеле 1.1 «Гістарыяграфія пытання»** вылучаны эканамічныя, архітэктурныя, сацыяльныя, культурныя, фальклорна-міфалагічныя аспекты вывучэння пытання ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Першым прадстаўніком беларускай гістарыяграфіі, які даследаваў корчмы ў эканамічным аспекце, стаў М. Доўнар-Запольскі (манаграфія «Дзяржаўная

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


## Спіс публікацый саіскальніка вучонай ступені

### Артыкулы ў навуковых выданнях, уключаных у пералік ВАК Рэспублікі Беларусь

1. Рогач, Л. Ф. Беларуская карчма (XVI–XIX стст.) / Л. Ф. Рогач // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 5 (94). – С. 13–20

2. Рогач, Л. Установы грамадскага харчавання на беларускіх землях у XVI – пачатку XX ст.: тыпавая і функцыянальная эвалюцыя / Л. Рогач // Весн. Гродз. дзярж. ун-та імя Янкі Купалы. Сер. 1, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. – 2013. – № 2 (152). – С. 38–48.

3. Рогач, Л. Чайная супраць карчмы (Барацьба з алкагалізмам на Беларусі ў 2-й палове XIX ст. / Л. Рогач // Беларуская думка. – 2014. – № 5. – С. 79–83.

### Артыкулы ў зборніках навуковых прац

4. Рогач, Л. Карчма / Л. Рогач // Куфэрак Віленшчыны: гісторыка-краязнаўчы і літаратурна-мастацкі альманах Віленскага краю; М. Казлоўскі (гал. рэд.), Т. Трафімава, А. Капуцкі, Э. Зайкоўскі (рэдкал.) [і інш.]. – Вільня, 2008. – № 1(13). – С. 74–76.

5. Рогач, Л. Ф. Карчма як цэнтр жыцця грамадства на беларускіх землях у XVI – пачатку XX ст. / Л. Ф. Рогач, С. В. Марозава // Сборник научных работ студентов высших учебных заведений Республики Беларусь «НИРС 2009» / редкол.: А. И. Жук (пред.) [и др.]. – Минск : Изд. центр БГУ, 2010. – С. 526–527.

6. Рогач, Л. Ф. Яўрэй-карчмар і карчма ва ўспрыняцці грамадства XVI–XIX стст. на падсвядомым узроўні / Л. Ф. Рогач // Рэха мінуўшчыны: зб. навук. работ студ. навук. таварыства факультэта гісторыі і сацыялогіі ГрДУ імя Я. Купалы / рэдкал.: А. С. Горны, А. М. Загідулін. – Гродна : ГрГУ, 2010. – С. 180–186.

7. Рогач, Л. Ф. Карчма на Беларусі (XVI – пач. XX стст.): характарыстыка і аналіз гістарычных крыніц / Л. Ф. Рогач // Наука-2010: сб. науч. ст. В 2 ч. / ГрГУ им. Я. Купалы; редкол.: А.Ф. Проневич (отв. ред.) [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2010. – Ч. 1. – С. 79–82.

8. Рогач, Л. Ф. Гандлёвыя асяродкі беларускіх земляў (шынкі, корчмы, кірмашы) у жыцці грамадства (XVI – пачатку XX стст.): гістарыяграфія і крыніцы / Л. Ф. Рогач, С. В. Марозава // Сборник научных работ студентов высших учебных заведений Республики Беларусь «НИРС 2010». – Минск : Изд. Центр БГУ, 2011 – С. 554–559.

9. Рогач, Л. Карчма як месца антыцарскіх выступленняў у другой палове XIX ст. / Л. Рогач // Капыль: гісторыя горада і рэгіёна: да 360-годдзя надання Капылю прывілея на магдэбургскае права: зб. навук. артыкулаў / Нац. Акад.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


навук Беларусі, Ін-т гісторыі; уклад.: А. А. Скеп’ян, А. А. Доўнар, І. В. Соркіна; рэдкал.: А. А. Каваленя. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – С. 272–282.

10. Рогач, Л. Матэрыялы па гісторыі ўстаноў грамадскага харчавання ў фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Мінск / Л. Рогач // Архівы і справаводства. – 2013. – № 1. – С. 115–123.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

11. Рогач, Л. Карчма ў Беларусі на аснове пісьмовых і археалагічных крыніц / Л. Рогач // Вывучэнне роднага краю як сродак патрыятычнага выхавання моладзі: матэрыялы студ. навук.-практ. канф., г. Мінск, 5 красавіка 2005 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка: рэдкал. А. І. Багдановіч (навук. рэд). – Мінск : БДПУ, 2005. – С. 52–56.

12. Рогач, Л. Унутраны свет беларускай карчмы ў аспекце яе функцыянальнага прызначэння (XVI–XIX стст.) / Л. Рогач // Студенческая наука как фактор личностного и профессионального развития будущего специалиста: материалы II студ. конф., Минск, 28 апреля 2006г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол В. В. Бущик [и др.]. – Минск : БГПУ, 2006. – С. 104–106.

13. Рогач, Л. Знешні і ўнутраны выгляд корчмаў на аснове археалагічных і пісьмовых крыніцаў (XVI-пач. XX стст.) / Л. Рогач // Европа: актуальные проблемы этнокультуры: материалы II Междунар. науч.-теорет. конф. г. Минск, 25 апреля 2008 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол. В. В. Тугай (отв. ред.), А. П. Житко, Г. А. Космач [и др.]. – Мінск : БГПУ, 2008. – С. 56–58.

14. Рогач, Л. Корчма как торгово-экономический центр жизни белорусского общества в XVI-начале XX вв. / Л. Рогач // Шевченківська весна. Історія: Матеріали Міжнародноі науково-практичтноі конференціі молодих учених (Київ, 20 березня 2008); Редкол.: проф. В. Ф. Колесник (голова), к. і. н. Ю. В. Латиш (відп. ред.). – Киев : СПД Цимбаленко Э. С., 2008. – С. 99–102.

15. Рогач, Л. Гарадская карчма на Беларусі (XVI – пач. XX стст.): крыніцы і гістарыяграфія / Л. Рогач // Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі: матэрыялы міжн. нав. канф., г. Гродна, 25–26 верасня, 2009 г.; рэдкал. В. В. Даніловіч, І. П. Крэнь, І. В. Соркіна, Г. А. Хацкевіч (адк. рэдактары) [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2009. – С. 317–324.

16. Рогач, Л. Ф. Корчмы і кабакі ў работах гісторыкаў перыяду Расійскай імперыі / Л. Ф. Рогач // Культура, наука, образование в современном мире: материалы V Межд. науч. конф., г. Гродно, 11–12 мая, 2011 г.; редкол.: Л.Л. Мельникова [и др.]. – Гродно, 2011. – С. 420–424.

17. Рогач, Л. Дзейнасць паліцыі па нагляду за ўстановамі грамадскага харчавання ў Гродзенскай губерніі / Л. Рогач // Европа: актуальные проблемы

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


этнокультуры: матер. межд. научно-теор. конф., г.Минск, 23 июня 2011 г. / Бел. гос. пед. ун-т. им. М. Танка; редкол. В. В. Тугай (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2011. – С. 169–172.

18. Рогач, Л. Корчмы ў гарадах Беларусі: маральныя стэрэатыпы паводзінаў у наведвальнікаў карчмы (XVI–XIX стст.) / Л. Рогач // Старажытныя гарады. Праблемы даследавання, музеефікацыі, захавання помнікаў і гістарычных тэрыторый: матэр. рэспубл. канф., г. Заслаўе, 25 мая 2010 г.; Гал. рэд. М. У. Сульдзіна. – Заслаўе : РЫФТУР, 2011. – С. 82–90.

19. Рогач, Л. Прававая рэгламентацыя функцыянавання гарадской сістэмы грамадскага харчавання ў Гродзенскай губерні ў XIX пачатку XX стст. паводле крыніц / Л. Рогач // Гістарычная урбаністыка: асновы метадалогіі і крыніцазнаўчая база: матэрыялы міжн. нав. канф., г. Гродна, 30 верасня – 1 кастрычніка, 2011 г.; рэдкал.: І. В. Соркіна (гал. рэд) [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2011. – С. 300–308.

20. Рогач, Л. Ф. Сістэма грамадскага харчавання ў Гродзенскай губерні / Л. Ф. Рогач // Гродненщина в историческом, экономическом и культурном развитии 1801–1921 гг. (к 210-летию образования Гродненской губернии): матер. межд. науч.-практ. конф. (Гродно, 22–23 сентября 2011 г.) / Гродн. обл. испол. ком.; ГрГУ им. Я. Купалы; редкол.: Г. А. Хацкевич (гл. ред.), Э. С. Ярмусик (зам. гл. ред.) [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2012. – С. 49–57.

21. Рогач, Л. Деятельность питейных заведений на белорусских землях в аспекте нарастающей проблемы пьянства и алкоголизма (I-я половина XIX ст.) / Л. Рогач // Дни науки исторического факультета: матер. V-й межд. научн. конф. (Київ, 25 квітня 2013); Редкол.: чл.-кор НАНУ, проф. В. Ф. Колесник [и др.]. – 2013». – Киев, 2013. – С. 96–97.

22. Рогач, Л. Установы грамадскага харчавання Беларусі ў XIX стагоддзі: спроба тыпалогіі / Л. Рогач // Гісторыя гандлю ў Беларусі (ад старажытнага часу да канца XX ст.): праблемы вывучэння і перспектывы даследавання: матэрыялы I Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 14–16 лістапада 2013 г.) / Цэнтр вывучэння гісторыі гандлю ТАА "Інстытут рознічных тэхналогій "Менка"; рэд. рада: Андрэй Кіштымаў, Захар Шыбека (сустаршыні) [і інш.]. – Мінск : Тэхналогія, 2014. – С. 150–159.

**Артыкулы ў навуковых энцыклапедычных выданнях**

23. Рогач, Л. Карчма / Л. Рогач // Вялікае княства Літоўскае: Энцылапедыя. У 2 т. / Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; Маст. З. Э. Герасімовіч. – Мн: Беларус. Энцыкл., 2007. – Т. 1: Абаленскі–Кадэцыя. – С. 63–64.

24. Сергачёв, С. Корчма / С. Сергачёв, Л. Рогач // Энциклопедия белорусской кухни (ред. кол. Т. В. Белова) [и др.]. – Минск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – С. 263–264.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


25. Рогач, Л. Шинок / Л. Рогач // Энциклопедия белорусской кухни (ред. кол. Т. В. Белова) [и др.]. – Минск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – С. 696.

26. Калядзінскі, Л. Карчма / Л. Калядзінскі, Л. Рогач // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя: у 2 т. / Рэдкал.: Т. У. Белова (гал. рэд.) [і інш.]. – Минск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. – С. 427–428.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


# РЭЗЮМЭ

**Вікол Людміла Фёдараўна**

**Фарміраванне і развіццё сістэмы грамадскага харчавання ў Беларусі ў XVI – пачатку XX стст.**

**Ключавыя словы:** сістэма грамадскага харчавання, установы грамадскага харчавання, карчма, права прапінацыі, піцейная манаполія, заканадаўчае рэгуляванне, соцыум, гандаль, культурны асяродак.

**Мэта даследавання:** раскрыць сутнасць грамадскага харчавання на тэрыторыі Беларусі ў XVI – пачатку XX стст. як сістэмы, якая мае структурную іерархію, функцыі, асаблівасці трансфармацыі ў сувязі з палітычнымі, эканамічнымі і сацыяльнымі зменамі ў грамадстве.

**Метады даследавання:** у працы выкарыстаны агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз, абагульненне, апісанне, індукцыя, дэдукцыя) і спецыяльна-гістарычныя метады (гісторыка-генетычны, гісторыка-сістэмны, гісторыка-тыпалагічны, гістарычнай рэтраспекцыі).

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** навуковы ўклад заключаецца ў комплексным даследаванні грамадскага харчавання як цэласнай сістэмы і грунтуецца на выяўленні, сістэматызацыі і аналізе вялікай колькасці архіўных і апублікаваных гістарычных крыніц. Значная колькасць архіўных крыніц, выяўленых у архівах Беларусі, Расіі, Польшчы, упершыню ўведзена ў навуковы абарот.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** матэрыялы дысертацыі могуць быць уключаны ў спецкурсы па гісторыі ўрбаністыкі, іўдаікі, культуралогіі, эканомікі, антрапалогіі, этналогіі. Вынікамі даследавання можна карыстацца пры стварэнні этнаграфічнага музею карчмы і рэканструкцыі карчмы як традыцыйнай установы харчавання на землях Беларусі, што набывае найбольшую актуальнасць у аспекце развіцця турызму і агратурызму. Магчымасць выкарыстаць выяўлены вопыт заканадаўча-прававога рэгулявання дзейнасці ўстаноў харчавання можа дазволіць удасканальваць далейшае кіраванне і рэгламентацыю сферы грамадскага харчавання.

**Галіна выкарыстання:** гістарыяграфія, гісторыя Беларусі, гісторыя культуры Беларусі, краязнаўства, турызм, правазнаўства, рэстаранная справа.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


# РЕЗЮМЕ


**Викол Людмила Фёдоровна**

**Формирование и развитие системы общественного питания в Беларуси в XVI – начале XX вв.**

**Ключевые слова:** система общественного питания, учреждения общественного питания, корчма, право пропинации, питейная монополия, законодательное регулирование, социум, торговля, культурная среда.

**Цель исследования:** раскрыть сущность общественного питания на территории Беларуси в XVI – начале XX вв. как системы, которая имеет структурную иерархию, функции в обществе, механизмы и особенности трансформации в связи с политическими, экономическими, социальными изменениями в обществе.

**Методы исследования:** в работе использованы общенаучные (анализ, синтез, обобщение, описание, индукция, дедукция) и специально-исторические методы (историко-генетический, историко-системный, историко-типологический, исторической ретроспекции).

**Полученные результаты и их новизна:** научный вклад заключается в комплексном исследовании общественного питания как целостной системы и основывается на выявлении, систематизации и анализе большого количества архивных и опубликованных исторических источников. Значительное количество архивных источников, выявленных в архивах Беларуси, России, Польши, впервые введено в научный оборот.

**Рекомендации по использованию:** материалы исследования могут быть включены в спецкурсы по истории урбанистики, иудаики, культурологии, экономики, антропологии, этнологии. Результатами исследования можно пользоваться при создании этнографического музея корчмы и реконструкции корчмы как традиционного заведения питания на землях Беларуси, что приобретает наибольшую актуальность в аспекте развития туризма и агротуризма. Возможность использовать выявленный опыт законодательно-правового регулирования деятельности учреждений питания позволяет в перспективе совершенствовать управление и регламентацию сферы общественного питания.

**Область использования:** историография, история Беларуси, история культуры Беларуси, краеведение, туризм, правоведение, ресторанное дело.

(ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ)


**SUMMARY**

**Vikol Liudmila Fiodorovna**

**Formation and development of catering in Belarus in the XVI - early XX centuries.**

**Key words:** catering, public catering establishments, tavern, propination right, drinking monopoly, legislative regulation, society, trade, cultural environment.

**The purpose:** to discover the essence of catering to the territory of Belarus in in the XVI – early XX centuries as a system that has a structural hierarchy, functions in the society, and especially the mechanisms of transformation in relation to political, economic and social changes in society.

**Research methods:** we used scientific methods (analysis, synthesis, generalization, description, induction, deduction), and specifically – historical (historical genetic, historical, systematic, historical and typological, historical flashbacks).

**Achieved results and their novelty:** scientific contribution is a comprehensive study of catering as an integrated system and is based on the identification, collation and analysis of large amounts of historical archival and published sources. A significant amount of archival sources identified in the archives of Belarus, Russia, Poland, first introduced in the scientific revolution.

**Recommendations for use:** materials of the thesis may be included in courses on the history of urbanism, Judaica, culture and economy. Results of the study may be useful in creating an ethnographic museum tavern and in reconstruction as traditional eating establishments on the Belarusian land. It acquires most actuality in the aspect of development of tourism and agrotourism. Possibility rely on the identification of legislative experience of legal regulation of food establishments can afford to further improve governance and regulation in the field of catering.

**Sphere of application:** historiography, the history of Belarus, Belarus cultural history, local history, tourism, law, restaurant business.